Аляксандр Субоцін:

«Нашы лаўрэаты – гонар Прыдзвінскага краю»

30 красавіка ў Віцебску ў Летнім амфітэатры прайшла цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны», прымеркаваная да Свята працы. 50 работнікаў, прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці, якія ўнеслі важкі ўклад у развіццё паўночнага рэгіёна ў 2024 годзе, сталі ўладальнікамі прэстыжнай узнагароды. Прыемна адзначыць, што ў ліку ўзнагароджаных – і наша зямлячка Кацярына ВАСІЛЕВІЧ, аператар пульта кіравання ў вытворчасці будаўнічых матэрыялаў ААТ «Обальскі керамічны завод». Падтрымаць абальчанку накіравалася наша дэлегацыя на чале з кіраўніком раёна Сяргеем Галынчыкам.

Стар. 4

«Нашы лаўрэаты – гонар Прыдзвінскага краю»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

– Сімвалічна, што ўрачыстасці праходзяць напярэдадні Свята працы, – адзначыў, вітаючы ўдзельнікаў мерапрыемства, старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін. – Бо менавіта праца – аснова дабрабыту і развіцця любога рэгіёна. Мы ўшаноўваем выдатных людзей, чыя праца, талент і прафесіяналізм узбагачаюць Віцебскую вобласць, садзейнічаюць яе эканамічнаму, сацыяльнаму і культурнаму прагрэсу. Нашы лаўрэаты – гонар Прыдзвінскага краю. Кожны з іх уносіць свой унікальны ўклад у агульную скарбонку дасягненняў, дэманструючы высокі прафесіяналізм, адданасць сваёй справе і шчырую любоў да роднага краю.

Кіраўнік вобласці падкрэсліў, што эфектыўная работа Віцебшчыны не адноўчы ў мінулым годзе адзначалася на пасяджэннях Савета Міністраў, а па выніках 2024 года рэгіён прызнаны найбольш эфектыўна працуючым. Аляксандр Субоцін выказаў упэўненасць, што ўсе планы і амбіцыйныя задачы могуць быць рэалізаваны дзякуючы агульным намаганням таленавітых і працавітых людзей.

Пасля прывітальнага слова старшыня аблвыканкама ўрачыў дыпломы лаўрэатам ганаровага звання. Спецыяльнай прэміі быў удастоены хакейны клуб «Віцебск», які стаў сярэбраным прызёрам чэмпіянату Беларусі сезона 2024/2025.

На мерапрыемстве ўшанавалі лаўрэатаў конкурсу «Чалавек працы-2024», ініцыянаванага абласным аб'яднаннем прафсаюзаў. Наша Кацярына Васілевіч – таксама ў ліку пераможцаў.

Пасля ўрачыстай часткі адбыўся святочны гала-канцэрт «Першамайская плошча», у якім выступілі зоркі беларускай эстрады, творчыя калектывы Віцебска і вобласці.

Да слова. *Прэмія «Чалавек года Віцебшчыны» ўручаецца ў рэгіёне больш за 20 год. За гэты час яе лаўрэатамі сталі звыш тысячы жыхароў Прыдзвінскага краю. Сёлета ўпершыню цырымонія прайшла ў Летнім амфітэатры.*

Алена КАРПУШЭНКА.